# Спартландыя
# "Для тых, хто гады не лічыць»

27 верасня 2018 года адбылася спартыўная забаўляльная праграма "Для тых, хто гады не лічыць», прымеркаваная да Дня пажылога чалавека.

Мерапрыемства праходзіла ў зале фізкультурна-аздараўленчага комплекса г. Ашмяны. Ініцыятарамі мерапрыемства былі супрацоўнікі аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" і работнікі ДУ " Ашмянскага раённага фізкультурна-спартыўнага клуба».

Вясёлая размінка, сяброўскае прывітанне каманд, спартыўныя спаборніцтвы з разнастайнымі заданнямі, дух спаборніцтвы спрыялі аздараўленню арганізма і выдатнаму настрою пажылых грамадзян.





